А я от себя еще раз напоминаю, что в начале 1990-х годов белорусский Сбербанк действительно развернул бурную деятельность по выдаче льготных кредитов коммерсантам, различного рода дельцам, проходимцам, решившим обзавестись дополнительными офисами, квартирами... Им охотно выдавались почти беспроцентные кредиты на строительство огромных дворцов и обустройство частных фирм. Так и хочется еще и еще раз спросить: почему эти "добрые", а точнее "преступные", деяния должны были осуществляться банком за счет обворованных вкладчиков? Почему незаконные кредиты были погашены инфляционными рублями? Почему многие из тех кредитов были возвращены банку только после активного вмешательства президента? Вот что конкретно по этому поводу сказал 9 марта 1999 года Александр Григорьевич: *"Была поставлена задача не просто разобраться в данном вопросе, а вернуть стране те деньги, которые в свое время раздавались налево и направо не в меру щедрыми руководителями банковских структур. Подобная благотворительность слишком дорого обошлась нашему народу и государству... Банковская сфера распоряжалась народными средствами как хотела. А выдавались кредиты прежде всего друзьям, знакомым, родственникам, собственным детям..."* Да и не так давно на страницах газет появились сообщения, что в стране расследуется более десятка уголовных дел о хищении с банковских счетов населения. И что в некоторых случаях эти суммы достигают нескольких миллионов долларов, а банки категорически не желают возмещать ущерб потерпевшим. Так что, уважаемая Надежда Андреевна, и наша (вернее ваша) банковская служба имеет прямое отношение к исчезновению банковских сбережений населения. И, видимо, зря, отвечая на второй вполне существенный вопрос Григория Алексиевича из Калинковичей "А почему компенсацию не могут выплатить банки? Ведь деньги находились у них...", вы в категоричной форме заметили: "Компенсацию по вкладам Советского Союза может осуществить только государство, а не банки, потому что речь идет о возмещении потерь от инфляционного обесценивания сбережений". А может быть, я чего-то недопонимаю, в чем-то заблуждаюсь?

А вот строчки из коллективного письма в одну из наших редакций от пенсионеров города Бобруйска Н.И.Делендик, Н.Н.Стрельцовой, В.Н.Полах, М.С.Жемолдиновой, А.В.Пановой и Т.М.Делендик. *"...Почему сегодня для компенсации украденных вкладов надо брать деньги только из бюджета, когда указом президента в 1996 году был создан специальный фонд и определены источники поступления в него. Сколько там накопилось денег за 17 лет, мы не знаем, а глава Нацбанка заявляет: вернуть сгоревшие вклады невозможно... Если денег в этом фонде нет, то кто в этом повинен?"* — совершенно правильно спрашивают ветераны. А я от себя лишь напомню, что средства из этого фонда не входили в состав государственного бюджета, то есть не могли быть использованы на иные, даже чрезвычайно важные цели, финансируемые из госбюджета.

А вот что пишет в одну из газет Надежда Дмитриевна Губаревич из г.п. Копысь Оршанского района: *"Я ветеран труда, мне уже более 80 лет. Работала во вредных условиях. На пенсию пошла по льготам. Собирала деньги на квартиру сыну, но он погиб на стройке в Минске, а вклад мой заморозили. Очень прошу, верните мне заработанные каторжным трудом деньги! Ведь теперь я живу в старом бараке, площадь комнаты 16 квадратных метров. Зимой замерзаю..."* До боли в сердце хочется, чтобы Надежда Дмитриевна как можно скорее смогла пользоваться своими кровными сбережениями, а они ей так нужны — на улучшение жилищных условий, на сносное питание и лекарства...

А нашим властным скептикам сразу же хочется сообщить, что уже в настоящее время Сбербанк России выплачивает компенсации по советским вкладам. При этом граждане до 1945 года рождения, правда, пока получают по три российских рубля за один советский, а рожденные позже — по два.

И еще обобранным до нитки нашим банковским вкладчикам очень хотелось бы знать, последует ли и когда-нибудь наша страна примеру своего "старшего собрата" по союзному государству? Или "союзное государство" — это пустой звук? И вспоминают о нем лишь тогда, когда рассчитывают извлечь из этого какую-то выгоду, заполучить какие-либо преференции?

Очень хотелось бы, чтобы по этому поводу на страницах СМИ наконец-то высказались наши банкиры и госчиновники, а также сами люди.

Константин РОМАНОВСКИЙ, пенсионер.

Минск.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Не пілі мы раней малако ад свіней...

Амаль тысячу тон валавых прываг свіней прыпісалі на свінагадоўчым комплексе "Лучоса". Згодна з дакументамі, сярэдняя вага нованароджаных парасят за два месяцы дасягала 30 кілаграмаў! Для гэтага ім трэба было высмоктваць па 10 літраў малака ў суткі. Што гэта значыць? Што за месяц свінаматка павінна даць 5000 літраў малака. Між тым у Віцебскай вобласці летась надой ад каровы складаў крыху больш за 4000 літраў...

Пра надоі і пра тоны
Размаўлялі два чыны:
Невялікі чын раённы
І вялікі — абласны.
— Наш раён убок не зверне,
А тым болей жа — назад!
Мы збяром нямала зерня:
На ячмень спадзеву шмат,
Ёсць на жыта перспектывы —
Па чатыры тоны з га.
Словам, спеюць нашы нівы,
Убірацьмем як мага...
Абласны начальнік строга
Глянуў-зыркнуў спадылба:
— Языком ты плешчаш многа,
А ў раёне — галыцьба.
І ці будзе тое жыта,
Ці падымецца ячмень —
Ніткай белаю прашыта:
На дварэ стаіць сухмень. —
Позірк больш яшчэ суровы, —
А чаму як ад казы
Малака ў вас ад каровы?
Нават меншы ў два разы!
Дый каб мець жа тыя літры,
Трэба добрыя кармы.
Чын раённы мовіў хітра:
— Малака надоім мы!
Заадно мы будзем з мясам!
Мецьмем болей, чым раней!
Наш раён апошнім часам
Стаўку робіць на свіней...
— Ты плявузгаеш не тое,
І не цямлю я ані.
Ці ж магчымыя надоі
Ад звычайнае свінні? —
Чын вялікі глянуў коса.
— Не маню, дальбог, зусім!
Наша слаўная "Лучоса"
Даказала гэта ўсім.
Там ад кожнай свінаматкі
Малака — па дзесяць тон!
Дык нашто гавяды статкі?
Вопыт той на ўвесь раён
Распаўсюдзіць мы гатовы, —
Ахапіў чынка кураж. —
А нашто тады каровы?
І не трэба нам сянаж...
Узбадзёрыўся без меры
Абласны вялікі чын:
— Дык рыхтуй хутчэй паперы —
Падтрымаем ваш пачын!
Ён ужо даўно чаканы,
Поспех сам ідзе ў руку!
Перавыканаем планы
Мы цяпер па малаку!
Пахвалой такой натхнёны
(Можа, будзе і медаль),
Невялікі чын раённы
З'ехаў з розуму амаль:
— Гэта толечкі пачатак...
Дайце некалькі гадкоў:
Сёння доім свінаматак,
Заўтра будзем і быкоў!


* * *

Чутка-паказка хадзіла,
А цяпер жа знае люд:
Не адно на свеце дзіва,
Не адзін на свеце цуд.
І, бадай, папраўку ўнесці
Можа кожны ў клёк сабе,
Што растуць і праўда дзесьці
Грушы-дулі на вярбе.

ВІНШУЕМ!

«Мы ганарымся тым, што маем такога нязломнага сябра...»

Калегі і сябры віншуюць зняволенага праваабаронцу Алеся БЯЛЯЦКАГА з Днём нараджэння.



25 верасня **Алесь Бяляцкі** сустракае за кратамі свой трэці дзень нараджэння. Прайшло ўжо два гады з моманту арышту віцэ-прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі за правы чалавека, актыўнага прадстаўніка беларускай грамадзянскай супольнасці, ініцыятара стварэння праваабарончага цэнтра **"Вясна",** які пасля быў зачынены ўладамі.

24 лістапада 2011 года беларускія ўлады вынеслі Алесю Бяляцкаму палітычна матываваны прысуд — чатыры з паловай гады зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Уплывовая міжнародная арганізацыя **Amnisty international** прызнала Алеся вязнем сумлення.

Набліжаецца адбыццё паловы прызначанага судом тэрміну. Па вызначэнні адміністрацыі папраўчай установы, Алесь Бяляцкі з'яўляецца *"злосным парушальнікам рэжыму"*, як і большасць іншых *"палітычных"*. За час знаходжання ў Бабруйскай калоніі ён атрымаў 8 вымоў, быў пазбаўлены некалькіх спатканняў з роднымі, харчовых перадач агулам на 8 месяцаў і права на амністыю 2012 года. Не тое што праваабарончая, нават літаратурная дзейнасць Алеся Бяляцкага небяспечная, па меркаванні дзяржаўных чыноўнікаў: ягоная кніга літаратуразнаўчых эсэ і нарысаў **"Асвечаныя беларушчынай"**, згодна з высновай экспертнай камісіі, *"можа нанесці ўрон іміджу Рэспублікі Беларусь"*. Вось такі небяспечны чалавек!

У адным са сваіх лістоў Алесь, аналізуючы 15-гадовы шлях "Вясны", напісаў: *"Увесну 2011 года мы паспелі сабрацца і адсвяткаваць наш юбілей разам з рэгіянальнымі актывістамі. А вось сустрэчу з калегамі-праваабаронцамі ў Мінску зладзіць не паспелі, хоць і планавалі яе. Але самай яркай хіба што падзеяй, якая сімвалічна падвяла рысу пад 15-гадовай гісторыяй "Вясны", была гісторыя, звязаная з маім арыштам. Гэтая падзея намі зусім не планавалася, але яна стала своеасаблівым вынікам, вяршыняй нашай дзейнасці. Слабых не чапаюць. Гісторыя "Вясны" яшчэ не скончана, яна працягваецца далей"*.

Так, сапраўды, жыццё рухаецца далей, і мы, калегі Алеся, спадзяёмся на працяг нашай сумеснай гісторыі, якая ўжо ёсць часткай агульнай гісторыі развіцця беларускага праваабарончага руху з яго цяжкасцямі і дасягненнямі.

Мы віншуем Алеся Бяляцкага з Днём нараджэння і жадаем як мага найхутчэйшай сустрэчы на волі! Мы ганарымся тым, што маем такога выдатнага, мужнага і нязломнага сябра, які застаецца прыкладам не толькі для нас, а для многіх-многіх людзей. Упэўненыя, што за цёмнай паласой жыцця абавязкова надыдзе светлая. Разам нас не перамагчы!

А ў падарунак — **верш Алеся Разанава "Палёт":**

Дакуль мне яшчэ трываць?
Птах, з якім я лячу праз імглістую
бездань часу, з няволі — у вызваленне,
са скрухі — у радасць, з цемры — у светлыню,
паварочвае да мяне галаву і кажа:
датуль, пакуль хопіць часу,
датуль, пакуль хопіць цябе самога,
датуль, пакуль хопіць нас...
Я кармлю птаха сваім целам,
паю сваёю крывёю
і перастаю ўжо адрозніваць, дзе ён,
а дзе я, а дзе час...
Усё загойваецца на мне маё цела,
усё аджывае ўва мне мая кроў,
усё патрабуе птах сабе новай ежы,
і ўсё доўжыцца праз стагоддзі
наш нерухомы палёт.

Мы чакаем цябе, Алесь!!!

Сябры-"вясноўцы".

УВАГА!

Запрашаем дзетак у беларускамоўныя групы ў дзіцячых садках Мінска!

Па ініцыятыве бацькоў з дапамогай грамадскай ініцыятывы "Вучымся па-беларуску" ствараюцца новыя беларускамоўныя групы ў дзіцячых садках Мінска: у Заводскім (м-н "Шабаны"), Фрунзенскім (пр.Пушкіна — вул.Адоеўскага) і Кастрычніцкім (вул.Ленінградская) раёнах.

Для пачатку работы груп неабходна іх дакамплектаванне.

Беларускамоўныя групы — гэта:

— магчымасць для вашага дзіцяці з маленства апроч рускай ведаць таксама і родную беларускую мову;

— паспяховае далейшае вывучэнне беларускай мовы ў школе;

— дапамога ў правядзенні нацыянальных святаў і конкурсаў для дзетак;

— бясплатныя беларускамоўныя кнігі і музычныя дыскі для вас і вашых дзяцей;

— магчымасць дадатковага навучання беларускім нацыянальным спевам і танцам;

— бясплатныя курсы па вывучэнні беларускай мовы для ўсіх жадаючых бацькоў.

Грамадская ініцыятыва "Вучымся па-беларуску" таксама дапаможа ў стварэнні беларускамоўных груп у іншых раёнах.

Просім распаўсюдзіць гэтую інфармацыю сярод вашых сяброў і знаёмых і далучыцца да ініцыятывы.

Тэл. +375 (029) 833-55-42 (Вікторыя)
belsadki@gmail.com
Група Вконтакте: http://vk.com/mova_dzecyam
Група ў Facebook:
https://www.facebook.com/groups/575303142506886/

МНЕНИЕ

...А им все мало

Все больше и больше чиновников попадает в тюрьму. В основном за коррупцию. Видите, им все мало. А ведь, как показывает статистика, средняя зарплата столичного чиновника в июле была больше тысячи долларов. Так это если брать всех-всех-всех. Понятно, мелкие клерки не имеют таких денег, зато их начальники накручивают себе суммы в два-три раза большие. И еще берут взятки!!! Да какие! До полумиллиона долларов!

Как искоренить эту заразу, то есть взяточничество? Предлагаю наполовину уменьшить численность чиновников. Довести их до того количества, которое существует в западных странах. Уверена, дела от этого не пострадают. Наоборот, работа каждого будет видна, как и то, чем он занимается за пределами исполнения служебных обязанностей.

Ольга КОРОБЕЙКО.

Гомель.

ЮБІЛЕЙ

Шчырыя кнігі Сяргея Чыгрына



Вербы над шчыраю Шчараю
Гушкаюць гнёзды гракоў,
Еду за шчасцем,
За светлаю нараю,
Еду я ў вёску да землякоў.
Або яшчэ:
Мова мая з-пад сахі,
Мова мая з-пад страхі,
Ластаўкай лёгкай лунае —
Мне не патрэбна чужая.

Гэта радкі з вершаў Сяргея Чыгрына, якія ўвайшлі ў першы зборнік "Шчырая Шчара". Ён выдадзены ў 1993 годзе.

Колькі потым напісана цудоўных кніг, газетных артыкулаў, вершаў! І ўсё пра родны край. Пра яго гісторыю, пра славутых беларускіх людзей. Такая багатая мова, такая высакародная і чуллівая душа аўтара! Ён нарадзіўся ў вёсцы Хадзявічы Слонімскага раёна. Скончыў тэатральнае аддзяленне Магілёўскага культасветвучылішча і філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў і беларускай асацыяцыі журналістаў. Жыве ў Слоніме. Доўгі час працаваў намеснікам рэдактара рэгіянальнай "Газеты Слонімскай", а цяпер — загадчык літаратурнай часткі Слонімскага драматычнага тэатра.

Сяргей Мікалаевіч напісаў і апублікаваў 25 асобных выданняў паэзіі, гісторыка-краязнаўчых і літаратуразнаўчых артыкулаў. Многія гісторыка-краязнаўчыя артыкулы ўвайшлі ў кнігу пад назвай "Пакліканы на родны парог", якая выйшла ў "Беларускім кнігазборы". Тут сабраны багаты матэрыял пра жыццё і дзейнасць беларускага празаіка, паэта і драматурга Кандрата Лейку, які жыў у канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. У сваіх апавяданнях і вершах Кандрат Лейка апісваў унутраны свет сваіх герояў, расказваў пра сацыяльныя канфлікты рэчаіснасці. Творы яго філасофскія і псіхалагічныя, разнастайныя па жанрах і тэматыцы.

У кнізе расказваецца таксама пра Гальяша Леўчыка, Казіміра Стаброўскага, Максіма Танка, Міколу Шкялёнка і многіх іншых славутых людзей.

Ёсць на Слонімшчыне вёска Чамяры. Дык вось адну са сваіх кніг Сяргей Чыгрын прысвяціў ёй і яе жыхарам. Выданне так і называецца "Чамяры і чамяроўцы". Некалі гэта была вялікая вёска, а цяпер, як і ўсе вёскі, яна вымірае. Але дзякуючы Сяргею Мікалаевічу не згубіцца на скрыжаваннях гісторыі, бо аўтар вельмі цёпла і маляўніча напісаў пра яе мінулае, пра людзей, якія тут жылі і жывуць, пра звычаі, святы, абрады.

У "Беларускім кнігазборы" выйшла таксама кніга "Мастак Антон Карніцкі". У ёй сабраны гісторыка-краязнаўчыя і мастацтвазнаўчыя нарысы малавядомага і забытага мастака са Слоніма і пра той час, калі ён жыў (1912—1944 гады). У кнізе сабраны малюнкі гэтага мастака, такія, напрыклад, як "Касцёл на Замосці", "Дзяўчына з ягадамі", "Бэз", "Хата ў Рушчыцах" і іншыя.

Дзякуючы Сяргею Чыгрыну ўпершыню ў Беларусі асобным выданнем выйшла кніга выбраных твораў беларускага паэта, публіцыста, журналіста, выдаўца і палітыка Сяргея Хмары (1905—1992), які з 1944 года жыў у эміграцыі. У кнігу ўвайшлі вершы і празаічныя творы, напісаныя аўтарам у розныя гады, таксама ўспаміны пра людзей, якіх Сяргей Хмара ведаў асабіста. Дык вось Сяргей Чыгрын сабраў гэтыя творы ў кнігу "Рабінавы хмель", зрабіў цікавую прадмову пад назвай "Жураўліны шлях паэта".

Шмат кніг спадар Чыгрын прысвяціў роднай Слонімшчыне. А зусім нядаўна яшчэ адзін унікальны літаратурны падарунак зрабіў гэты таленавіты чалавек сваім землякам. У "Беларускім кнігазборы" выйшла ў свет надзвычай цікавая кніга пад назвай "Слонімскі буквар". Гэта выданне ўяўляе сабой своеасаблівы даведнік па горадзе Слоніме і раёне, дзе арганічна перапляютаюцца мінулае і сучаснае Слонімшчыны. Жыхары раёна (і не толькі) высока ацанілі выданне, нават прыйшлося выдаваць дадатковы тыраж.

24 верасня ў Сяргея Мікалаевіча Чыгрына юбілей: яму спаўняецца 55 гадоў. Ад сябе і ад шматлікіх прыхільнікаў яго таленту шчыра віншую гэтага цудоўнага чалавека і жадаю моцнага здароўя і вялікіх поспехаў у творчасці, дабрабыту і шчасця!

І яшчэ радкі з аднаго верша, якія нібы сталі дэвізам жыцця спадара Чыгрына:

Разам з народам сваім застануся —
Гору дамо мы рады,
Дайце дарогу маёй Беларусі
Да Праўды!

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

г.Слонім.

«КРУГЛЫ СТОЛ»

Расійская авіябаза: чаму беларусам трэба непакоіцца?

Партыя БНФ упершыню за многія гады правяла грамадскія слуханні па тэме, якая не дадала спакою беларускаму грамадству. Планы Расіі размясціць на нашай тэрыторыі сваю авіябазу многія ўспрынялі не як дадатковую гарантыю бяспекі, а, наадварот, як пагрозу. Чаму? Прапануем вам тэзісы асноўных выступоўцаў.

«Заточен» для ударов

Александр АЛЕСИН, военный обозреватель:



— Сначала я выскажусь по технической стороне вопроса. Вы, наверное, помните, что в апреле министр обороны России Шойгу заявил, что Россия разместит в Беларуси авиабазу, на которой будет размещаться истребительный авиационный полк наряду с системой ПВО С-300. Будет четыре дивизиона поставлено. Теперь мы уже видим развитие событий: россияне выбрали для себя аэродром под Лидой, который находится вблизи литовской границы. Это место удобное: одинаково досягаемы цели и в Польше, и в Литве. Надо думать, что это не случайно. Если мы возьмем тип самолета, который, как объявили россияне, там будет базироваться, то это Су-27 СМ3. И это не просто истребитель, а многофункциональный ударный самолет. Что значит ударный? Это значит предназначенный в том числе и для ударов по земле, по наземным целям. Если мы возьмем его дальность (а это 1500 километров) и проведем от Лиды радиус в 1500 километров, то увидим, что в него попадает множество целей в Литве, в Балтийском море, на территории Польши и так далее.

Что такое этот самолет? Су-27 СМ3 — носитель тактических вооружений, дальность которых может достигать от нескольких сотен до, как некоторые российские источники пишут, 2500—3000 километров. Его бортовой приборный комплекс позволяет нести широкую гамму вооружений, начиная от управляемых авиационных бомб и заканчивая противорадиолокационными и противокорабельными ракетами, а также ракетами, которые предназначены для поражения защищенных объектов.

В связи с такой характеристикой этого самолета возникает сомнение в официальной версии, которой российская сторона обосновывает размещение этого полка на территории Беларуси. Они говорят: "Это в рамках единой системы ПВО для укрепления обороны белорусского неба". Но технические возможности этого самолета избыточны для защиты белорусского неба. Этот самолет по своим ударным возможностям по земле в 2—2,5 раза превосходит истребитель Су-27, который до недавнего времени находился на вооружении белорусской армии. Этот самолет "заточен" для ударов именно по объектам, и судя по всему, если взять политическую обстановку, по объектам на территории Польши и стран Балтии. Это прежде всего радиолокационные станции и пусковые шахты противоракетной обороны, которые намечаются в Польше на 3-м этапе размещения ПРО. Очевидно, что это будет база американских истребителей F-16, которая появится на территории Польши к концу текущего года. Это могут быть радиолокаторы и портовые сооружения на территории стран Балтии.

Здесь мы имеем типичное "наведение тени на плетень". Эти самолеты в первую очередь предназначены для ударов по земле. Если бы россияне хотели защитить беларуское небо, то сюда лучше было бы направить чистые перехватчики, например, МиГ-31Б. Четыре таких самолета способны закрыть все воздушное пространство Беларуси, не нужно никакого полка. Они эффективно борются с крылатыми ракетами. Они в этом смысле заменяют АВАКС, то есть четыре самолета генерируют такое радиолокационное поле, которое способно закрыть всю территорию Беларуси. Значит, то, что вместо перехватчика нам подсовывают ударный самолет, говорит о том, что в планах российского командования не столько оборонительные задачи, но и, возможно, нанесение ударов по территориям сопредельных государств, по их наземным объектам.

Есть такая интересная особенность: по своим возможностям Су-27 СМ3 может быть носителем и ядерного оружия. Ради справедливости скажем, что F-16, который в Польше будет размещен, тоже носитель ядерного оружия. С точки зрения международного права, если эта база будет экстерриториальной и находиться под российской юрисдикцией (тогда это будет российская территория), размещение там ядерного оружия не противоречит международному праву. Понимаете, в какую историю мы можем попасть? Представляете, если вдруг обострится международная ситуация, что там может быть? Я, конечно, чисто гипотетически эту идею развиваю, но, когда начинается война, правил никто не соблюдает. Поэтому есть еще такая гипотетическая угроза. Кроме того, мы получаем на своей территории цель, на которую будут направлены и крылатые ракеты, и бомбардировщики стран НАТО. Поэтому с этой точки зрения мы видим очень большую опасность этого объекта как цели.

Более того, если это будет российская юрисдикция, возникают вопросы: кому будут подчиняться, кто будет командовать, кто будет отдавать приказы на вылет, формировать задания, определять боевую нагрузку и так далее? Это вопросы, которые требуют уточнения. В принципе, общественность должна потребовать, чтобы власть эти все моменты разъяснила, а именно: кто будет командовать, каким уставам будут подчиняться и под какой юрисдикцией будет эта база? Если экстерриториальная юрисдикция, то это российская территория; если по белорусским законам, то, значит, по белорусским законам. Но это обязательно нужно уточнить.

Ігар ЛЯЛЬКОЎ, намеснік старшыні Партыі БНФ:

— Было заяўлена пра тое, што гэтая база можа быць створана ўжо да канца гэтага года. Як вы лічыце, наколькі гэта тэхнічна магчыма?

Александр АЛЕСИН:

— Россияне заявили, что там будут базироваться 20—22 самолета Су-27 СМ3. На самом деле у них нет такого количества самолетов, у них пока только 12. До конца этого года там будет размещена авиационная комендатура в составе звена из четырех самолетов. Окончательно полк должен быть сформирован к 2015 году. Но производство такого количества самолетов Су-27 СМ3 нет в планах российского авиапрома. Значит, там могут быть размещены самолеты Су-30, которые имеют еще более расширенные возможности для ударов по земле. На самом деле все это значит, что они как бы "первую лапку" поставили на эту территорию, а потом всей своей мощью там освоятся.

Начало операции «Преемник»

Андрей ПОРОТНИКОВ, аналитик проекта Belarus Security Blog:



— Как размещение российской военной базы влияет на укрепление белорусской военной мощи? Конечно, оно никак не влияет, потому что иностранная база и иностранные военные остаются в подчинении и распоряжении собственного руководства. Поэтому, безусловно, если речь идет об укреплении своего собственного оборонительного потенциала, рассчитывать нужно только на себя, а не на то, что придут какие-то иностранцы и вместо нас и за нас будут что-то делать.

Что касается самой географии базы... У меня был опыт общения с российскими военными с военной базы в Крымске, которые вполне вероятно могут быть размещены в Беларуси. Там эти Су-27 СМ3 находятся на постоянной дислокации. Как сказал господин Алесин, российская военная база в Беларуси будет располагаться в 38 километрах от границы с Литвой. Из этой точки достаточно легко можно достать массу целей на территории Польши и Литвы, но и с территории Польши и Литвы также достаточно просто будет достать эту точку. Тем более можно отметить, что современная система ствольной артиллерии НАТО имеет дальность до 60 километров. А между Лидой и границей с Литвой никаких белорусских воинских частей нет. Поэтому я бы не стал говорить о каком-то военном потенциале этой базы.

Сама численность базы — 20—22 самолета. На сегодняшний день у поляков есть 48 истребителей F-16 именно ударной модификации. Еще такое же количество будет передислоцировано из Италии, из Авиано. К тому же у них имеется значительное количество более старых, но активно модернизируемых самолетов МиГ-29. Совершенно очевидно, что 20 самолетов, какие бы ударные возможности они ни имели, не смогут противостоять группировке, в 4—5 раз превышающей их по численности.

Насколько актуален вопрос о защите белорусского неба? Есть масса документов российского МИД, в частности Концепция о внешней политике, которая очень четко определяет Запад в качестве союзника России. Говорить о каком-то вероятном конфликте в нашем регионе на текущий момент не приходится. Соответственно, нет чистой оборонительной необходимости в этой базе. Скорее здесь можно говорить о политических аспектах. Имеются в виду внутриполитические аспекты в России. Достаточно отметить, что база должна быть создана к 2015 году. Все мы помним, какое событие будет в 2015 году. До этого 2015 года неплохо было бы гарантировать уровень российской поддержки хотя бы в том виде и в том размере, в котором он есть сейчас. А в России дела тоже не лучшим образом обстоят. Если 1—1,5 месяца назад они говорили очень размыто о бюджетном маневре, то сейчас открыто говорят о секвестре. Ситуация экономическая там далеко не лучшая. Будут ли они в состоянии и дальше поддерживать белорусские власти в том объеме, в каком они делают это сейчас, — вопрос более чем открытый. Поэтому я все-таки был бы склонен рассматривать вопрос о создании российской базы под углом тех внутриполитических процессов, которые имеют место у них и у нас, а не с точки зрения оборонной политики.



Артем ШРАЙБМАН, журналист:

— Вы сказали, что именно политический аспект является ключевым в этом вопросе. Зачем это России, если особой военной значимости эта база не несет?

Андрей ПОРОТНИКОВ:

— Это начало операции "Преемник". Далеко не факт, что Путин досидит до 2018 года. Давайте вспомним, как приходил к власти Медведев. Его назначают вице-премьером по нацпроектам, туда вбрасываются колоссальные деньги. Он выигрывает президентские выборы, что бы там кто ни говорил, он их выиграл, люди за него проголосовали, кандидатура его было достаточно раскрученная. Эти нацпроекты, соответственно, моментально испаряются, никто о них не вспоминает. Сейчас высока вероятность того, что в качестве преемника будет выступать министр Шойгу, один из таких долгожителей-тяжеловесов российской политики. И смысл базы — это показать его в качестве такого успешного и сильного лидера, который в состоянии не только навести порядок в России. Достаточно обратить внимание на то, как его персону раскручивали, когда он был министром по чрезвычайным ситуациям. Тогда они презентовали себя как наиболее успешное министерство. Таким образом хотят показать, что он может быть успешным не только во внутрироссийских делах, но и на международной арене. Все-таки этот комплекс великодержавия там достаточно силен, и во многом с ним связана вся эта активизация внешних проявлений военной активности, расширение военного присутствия в Таджикистане и Кыргызстане. Все это имеет смысл увязывать именно с политикой по передаче власти.

Александр АЛЕСИН:

—У меня есть небольшое уточнение. Если судить по высказываниям авторитетных российских экспертов, россияне намечают расположить там не полк, а смешанную авиационную дивизию, которая будет состоять из полка ударных самолетов, из полка чистых перехватчиков и из фронтовых бомбардировщиков СУ-34. Еще вопрос, когда это будет озвучено официально, но авторитетные эксперты говорят, что этого маловато. Что может сделать один полк? Поэтому я думаю, что здесь имеют место и политические, и геополитические, и стратегические соображения. Нам остается ждать развития событий.

Юрый ЧАВУСАЎ, палітолаг:

— Калі гэта расійскія ўнутрыпалітычныя гульні, тым больш завязаныя на аперацыю "Пераемнік", ці ёсць у Расіі вайсковая магутнасць, вайсковыя рэсурсы, каб забяспечыць паўнавартасную вайсковую прысутнасць у Беларусі: не толькі базу, але і каб стварыць тут, так скажам, новую беларускую вайсковую акругу?

Андрей ПОРОТНИКОВ:

— Нет, таких ресурсов нет и уже не будет. А планы по созданию авиабазы на уровне разговоров гуляют уже последние лет десять. Но это могло быть связано с тем, что русские очень активно вбрасывали деньги на поддержание аэродромной инфраструктуры. Это очень недешевое хозяйство: одна взлетно-посадочная полоса стоит от 30 до 100 миллионов долларов. Почему они это делали? Потому что существует соглашение в рамках СНГ о том, что в критических ситуациях они могут воспользоваться данной инфраструктурой. Шойгу, уже будучи министром, озвучил эту уже формализованную договоренность.

Квазістратэгія квазіпалітыкі

Дзяніс МЕЛЬЯНЦОЎ, палітолаг:



— Я спынюся на геапалітычным аспекце пашырэння беларуска-расійскага вайсковага супрацоўніцтва.

Па-першае, я хацеў бы пагадзіцца з Андрэем Паротнікавым, калі ён сказаў, што сапраўды ў размяшчэнні гэтай базы не так шмат вайсковай логікі і гэта нават не элемент стратэгіі. Тут мае месца прыярытэт палітычнай рацыі. Я б нават сказаў, што гэта выключна палітычная, а не вайсковая дзея.

Эфект пашырэння ці само пашырэнне беларуска-расійскага вайсковага супрацоўніцтва значна перабольшаны. У нас і так ёсць адзіная групоўка войск, у нас ёсць вайсковыя аб'екты. Вайскова-палітычныя, вайскова-тэхнічныя адносіны паміж краінамі вельмі шчыльныя. Фізічная прысутнасць расійскіх самалётаў не робіць нашы адносіны кардынальна іншымі.

Я таксама з Аляксандрам Барысавічам Алесіным пагаджаюся, што сапраўды для Расіі гэта хутчэй элемент палітычнага кантролю. Расія спрабуе застабіць гэтую тэрыторыю, тэрытарыяльна адзначыць сваю прысутнасць, з тым каб уплываць у тым ліку і на палітычную сітуацыю ўнутры Беларусі.

Калі мы бяром з вайсковага пункту гледжання, то ўжо сказана пра малаімавернасць канфлікту паміж Расіяй і Захадам. Я б увогуле адкінуў такую імавернасць. На сённяшні дзень і Расія, і Захад знаходзяцца ў такім стане, што наўпраставае вайсковае сутыкненне паміж НАТА і Расіяй можна проста выключыць, яго не можа быць. Калісьці спадар Бжэзінскі нават выказаў такую думку, што трэба яшчэ дакладна ведаць, ці сапраўды ў Расіі расійская эліта. У тым сэнсе, што на сённяшні дзень нельга казаць пра Расію як пра нейкі іншы полюс у міжнароднай палітыцы, які супярэчыць заходняму полюсу, як гэта было падчас "халоднай вайны". На сённяшні дзень Расія хутчэй здзяйсняе тое, што адзін расійскі аналітык назваў "квазістратэгіяй квазізнешняй палітыкі".

Чаму стаў магчымым такі крок Расіі ў палітычным гледзішчы? Па-першае, з-за таго, што на сённяшні дзень Захад губляе цікаўнасць да нашага рэгіёна, а з іншага боку, цікаўнасць Расіі да нашага рэгіёна ўзмацняецца. На сённяшні дзень, як вы ўсе ведаеце, ЗША заняты вырашэннем праблем на Блізкім Усходзе. Яны заняты тым, што спрабуюць пабудаваць зону вольнага гандлю з Еўрапейскім Саюзам. У іх шмат праблем у дасягненні энергетычнай незалежнасці, энергетычнай бяспекі. І яны не разглядаюць рэгіён паміж Расіяй і Еўрапейскім Саюзам ці ўвогуле постсавецкі рэгіён як нейкі варты ўвагі кавалак зямлі, таму што збольшага праблемы там вырашаны. Ён не прадстаўляе аніякай стратэгічнай пагрозы для заходняга свету.

З іншага боку, для Расіі зараз ёсць вельмі спрыяльны гістарычны момант, і яна гэта вельмі добра адчувае: Расія знаходзіцца на піке сваёй постсавецкай магутнасці. І расійскае кіраўніцтва ведае, што пасля гэтага будзе толькі горш. Вельмі хутка надыдзе энергетычная рэвалюцыя, надыдзе падзел энергетычнага рынку. Усе вы ведаеце пра пытанні і сланцавага газу, і бітумных пяскоў, пра тое, што Злучаныя Штаты ўжо фактычна дасягнулі незалежнасці па газу і гэтак далей. То бок расійскае кіраўніцтва адчувае, што іхныя тлустыя гады заканчваюцца і зараз апошні спрыяльны момант для экспансіяніцкай палітыкі, для таго, каб падабраць тое, што яны калісьці згубілі.

Чаму праваліўся інтэграцыйны праект 1990-х гадоў, але чаму зараз мы бачым вельмі канкрэтныя і дастаткова эфектыўныя крокі Расіі ў накірунку інтэграцыі постсавецкай прасторы? Таму што сапраўды пад гэта ёсць фінансы і пад гэта ёсць палітычная воля, падмацаваная тым веданнем, што далей будзе толькі горш. І калі яны зараз гэтую "лапку" не паставяць на пэўныя тэрыторыі, надалей спрабуючы пашыраць свой уплыў, то яны больш гэтую "лапку" на гэтую тэрыторыю не паставяць ніколі. Адсюль такія вельмі хуткія, фарсіраваныя тэмпы пабудовы і Мытнага саюза, і Еўразійскага эканамічнага саюза.

Разам з тым гэтая квазіпалітыка, ці "як бы знешняя палітыка", не скіравана на канкрэтную сур'ёзную канфрантацыю з Захадам. Яна не мае амбіцый пабудовы такога ж самага па магутнасці і ўплыве саюза, якім з'яўляецца, напрыклад, Еўрапейскі Саюз. На маю думку, гэта хутчэй спроба нарасціць свой знешнепалітычны, міжнародны імідж. Таму я так і кажу: як бы палітыка. На сённяшні дзень Расія не гатова ўваходзіць у нейкае супрацьстаянне з Захадам.

Некалькі гадоў таму на Захадзе была папулярна такая канцэпцыя, як "Расія паўстае з кален, Расія ўзмацняецца". На сённяшні дзень гэтая канцэпцыя ўжо сыходзіць у нябыт. Зараз у еўрапейскіх сталіцах ёсць разуменне, што ўсё, што адбываецца вакол гэтых расійскіх інтэграцыйных праектаў і расійскага "бразгання зброяй" — гэта хутчэй нейкія несур'ёзныя рэчы, да якіх трэба ставіцца такім чынам: Расіі трэба даваць захаваць твар, то бок успрымаць як нешта сур'ёзнае, але ўсе вядуць сваю палітыку так, быццам Расіі няма ўвогуле.

Але разам з тым такія гульні ў інтэграцыю, надзіманне шчок прыводзяць да таго, што ў такіх краінах, як Беларусь, Арменія (у святле яе апошняй пераарыентацыі), Малдова, Украіна, маюцца канкрэтныя негатыўныя наступствы. То бок такая не зусім адказная расійская палітыка прыводзіць да таго, што трашчаць ільбы ў гэтых краін, для якіх гэта эканамічныя страты, іміджавыя страты, дэзарыентацыя і ў знешняй, і ва ўнутранай палітыцы. Гэты эфект мы бачым на прыкладзе Украіны, на прыкладзе Арменіі, якая пасля таго, як выканала вельмі шмат патрабаванняў па падпісанні дамовы пра асацыяцыю з Еўрапейскім Саюзам, вымушана зараз проста цалкам пераарыентавацца на Мытны саюз.

Падагульняючы, я хацеў бы сказаць, што на сённяшні дзень я б не перабольшваў вайсковую пагрозу таго, што тут будзе прысутнічаць расійская вайсковая база. Але тут ёсць вельмі канкрэтныя пагрозы палітычнага кшталту, якія дэстабілізуюць і напаляюць міжнародную сітуацыю вакол нашага рэгіёна, што адбіваецца і на двухбаковых, і на шматбаковых стасунках нашай краіны з іншымі краінамі.

Юрый ЧАВУСАЎ:

— Ці правільна я зразумеў, што для такіх дзяржаў, як наша, фактычна з боку Захаду выдадзены такі мандат на кантроль з боку Расіі, то бок мы робімся падмандатнай тэрыторыяй?

Дзяніс МЕЛЬЯНЦОЎ:

— Фармальна так нельга казаць, няма ніякага пакта Молатава—Рыбентропа, які б гэта фіксаваў. Але фактычна, я думаю, ёсць разуменне, што зараз гэта тэрыторыі, якія, з аднаго боку, спрэчныя, а з іншага — замацаваны пэўны прыярытэт уплыву на гэтыя тэрыторыі Расійскай Федэрацыі.

Юрый ЧАВУСАЎ:

— Але ў кантэксце вашага завяршальнага тэзіса, што гэтыя гульні з вайсковымі базамі напаляюць абстаноўку ў рэгіёне, ці магчыма, што цікаўнасць да рэгіёна падвысіцца і Захад зменіць стаўленне да стратэгічнай значнасці Усходняй Еўропы?

Дзяніс МЕЛЬЯНЦОЎ:

— Я так не думаю. На дадзеным этапе ў нашай цяперашняй сітуацыі такія крокі, хутчэй, не працуюць на гэта. Але ўзгадаем, якім чынам НАТА распаўсюдзіла канкрэтныя планы па абароне Балтыі на тры краіны Балтыі. Калі яны ўступалі ў НАТА, то ніякіх планаў па іх канкрэтнай абароне не было, то бок яны проста ўступалі ў вайскова-палітычны блок без аніякіх практычных гарантый. І гэтыя краіны разам з Польшчай скарысталіся тым, што ў нас праводзяцца вучэнні "Захад" разам з Расійскай Федэрацыяй, і кожны год нагняталі атмасферу аж да таго, што казалі, нібы Беларусь з Расіяй збіраюцца нападаць на іх тэрыторыі. Праз гэта яны прымусілі кіраўніцтва НАТА распаўсюдзіць на сябе "contingencyplanning". Пры гэтым абсалютна ўсе цудоўна разумелі, што ніколі ў жыцці ні Расія, ні Беларусь не нападуць на сябраў НАТА. Але з тым, каб гэтыя спадары ў міністэрствах абароны і ў прэзідэнтурах балтыйскіх краін проста супакоіліся, яны напісалі гэтыя планы па іх абароне і ўклалі ў гэта велізарныя грошы. Толькі гэта не значыць, што яны сапраўды пачалі ўспрымаць Беларусь як нейкую крыніцу пагрозы.

Я думаю, што прыкладна тое ж самае адбудзецца і зараз: Польшча запатрабуе пэўныя гарантыі ад НАТА, Літва таксама. Але прафесіяналы зноў жа ўсё цудоўна разумеюць.

Юрый ЧАВУСАЎ:

— А ў кантэксце таго, што сказаў спадар Алесін пра тэхнічную і юрыдычную магчымасць размяшчэння на экстэрытарыяльных вайсковых базах ядзернай зброі, такая магчымасць змяніла б геапалітычную сітуацыю ў рэгіёне, прымусіла б разглядаць рэгіён як іншы ў плане стратэгічнага значэння?

Дзяніс МЕЛЬЯНЦОЎ:

— Безумоўна, так. Але ў міжнародным праве ёсць сур'ёзная лакуна, то бок усе гэтыя вялікія дамовы па скарачэннях датычаць стратэгічных узбраенняў, яны не датычаць тактычных узбраенняў. А гэта тактычнае ўзбраенне, таму яно не падлягае кантролю.

Александр АЛЕСИН:

— Я уточню немного. Все дело в том, что мы упускаем такого важного игрока, как военно-промышленный комплекс России. Россия сейчас проедает очень большой военный бюджет. Как обосновать Думе, народу необходимость больших военных бюджетов? Тем, что существует некая военная угроза. В подтверждение такой угрозы нужно создавать некую напряженную ситуацию или хотя б имитировать ее. Мы знаем, что российские военные, особенно старые, всякие геополитические академики во главе с Леонидом Ивашовым на самом деле люди достаточно консервативные, готовятся к прошлой войне и помнят прошлые обиды. Поэтому этот фактор тоже играет большую роль, ведь деньги очень большие. Путин говорит, что ВПК — это локомотив российской экономики в техническом плане, и он должен его вытянуть. Но не всегда желание инициаторов совпадает с конечным результатом. Тоже не известно, какую власть в России могут приобрести военные и представители ВПК, если ситуация там ухудшится.

Мы — супраць

Аляксей Янукевіч, старшыня Партыі БНФ:

— Калі казаць пра пазіцыю Партыі БНФ, то яна вельмі ясная: мы катэгарычна супраць размяшчэння расійскіх вайсковых баз. Мы перакананы, што гэта супярэчыць карэнным нацыянальным інтарэсам Беларусі. Мы неаднаразова звярталіся да ўлад з заклікам правесці грамадскія слуханні. Улады на гэтыя грамадскія слуханні не пайшлі, не арганізавалі іх. Я думаю, што гэта не дзіва, таму што, паводле сацыялагічных апытанняў, толькі пятая частка беларусаў сёння пазітыўна ставіцца да размяшчэння такой вайсковай базы, а большасць сёння выступае супраць. Я думаю, што ўлады ведаюць гэтыя даныя, і гэта ёсць прычына, чаму актывістам Партыі БНФ па ўсёй Беларусі адмаўляюць у праве на правядзенне пікетаў супраць размяшчэння гэтых расійскіх вайсковых баз. Больш за 20 заявак было пададзена, і ніводная не была ўхвалена.

Запісаў Алег СНОЎ.

ПАДЛІЧЫЛІ

Паўмільярда!

Асабістыя грашовыя пераводы, атрыманыя грамадзянамі Беларусі з-за мяжы, склалі амаль 510 мільёнаў долараў.

Гэта на 27,7% больш, чым у аналагічны перыяд 2012 года, паведамляе Агенцтва фінансавых навін са спасылкай на статыстычную справаздачу Нацбанка.

Паступленні ад аплаты працы склалі каля 300 мільёнаў долараў. Акрамя таго, у першым паўгоддзі 2013 года грашовыя пераводы працуючых склалі каля 230 мільёнаў долараў.

У той жа час асабістыя пераводы, выплачаныя за мяжу, сёлета ў першым паўгоддзі склалі менш за 69 мільёнаў долараў. У параўнанні з першым паўгоддзем мінулага года яны павялічыліся на 6%.

РЭГІЁНЫ

Каранцін зняты

У двух афіцыйна прызнаных ачагах афрыканскай чумы свіней — вёсцы Чапунь на Гродзеншчыне і свінакомплексе "Лучоса" ў Віцебскай вобласці — зняты каранцін, уведзены ў сувязі з захворваннем жывёл.

Пры гэтым раней уведзеныя забароны застаюцца ў сіле, свіней заводзіць па-ранейшаму нельга. Дазволу завесці парсючкоў на асабістых падвор'ях цяпер трэба чакаць не раней як праз паўгода. Ды і толькі ў тым выпадку, калі не будзе зарэгістравана новых успышак захворвання.

У Давыд-Гарадку пабіліся беларусы і цыганы

Праваахоўнікі заяўляюць, што канфлікт адбыўся не на нацыянальнай глебе, а на пабытавай.

Як піша газета "Заря", два палешукі ў Давыд-Гарадку ўначы вярталіся з вечарынкі і "зачапіліся" з двума цыганамі. Пазней да канфлікту далучылася яшчэ па адным чалавеку з абодвух бакоў.

Потым ледзь не дайшло да трагедыі: раз'юшаны цыган, узяўшы сякеру, параніў трох беларусаў і пашкодзіў легкавік сваіх працўнікаў. Бойку спыніў нарад міліцыі. Па версіі міліцыянтаў, хлопцы пабіліся пад уздзеяннем алкаголю.

На сёння ў сямітысячным Давыд-Гарадку кампактна жыве каля 400 цыганоў. Па словах міліцыянтаў, нягледзячы на гэта, канфліктаў на нацыянальнай глебе не адбываецца. Праўда, у чэрвені разлаваны нечым мясцовы жыхар страляў з паляўнічай стрэльбы па двух цыганах. На шчасце, ён не пацэліў і атрымаў штраф за пагрозу забойства.

Наркарэкорд

Беларускія чэкісты канфіскавалі рэкордную партыю гераіну — больш за 27 кілаграмаў.

"Падчас закладкі наркотыкаў у схованку, размешчаную каля трасы Магілёў—Мсціслаў, супрацоўнікамі КДБ і байцамі спецпадраздзялення "Альфа" былі затрыманы трое ўдзельнікаў міжнароднай злачыннай групы, якая складалася з грамадзян Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі (абодва ўраджэнцы Чачэнскай Рэспублікі), а таксама грамадзяніна Рэспублікі Таджыкістан. У выніку агляду месца здарэння выяўлены і канфіскаваны поліэтыленавыя скруткі з асабліва небяспечным наркатычным сродкам — гераінам", — паведаміла прэс-служба беларускага КДБ.

У дачыненні да затрыманых ўпраўленне КДБ па Магілёўскай вобласці ўзбудзіла крымінальную справу па прыкметах злачынства, прадугледжанага ч.3 арт. 328 (незаконны абарот наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў і аналагаў) КК Рэспублікі Беларусь. Санкцыя артыкула прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам ад 8 да 13 гадоў.

Праверце тэлевізар

Аналагавае эфірнае тэлевяшчанне спыняецца яшчэ ў двух гарадах. З 1 кастрычніка тыя, хто мае старыя тэлевізары, не змогуць глядзець ТБ у Жлобіне і Бабруйску.

Мінсувязі нагадвае, што паэтапны графік адключэння аналагавага тэлевяшчання ў Беларусі, разлічаны да сярэдзіны чэрвеня 2015 года, прадугледжвае адключэнне ў бягучым годзе аналагавых перадатчыкаў у 4 населеных пунктах — Асіповічах, Бабруйску, Жлобіне, а таксама з 1 лістапада ў Касцюковічах.

Для таго каб глядзець тэлепраграмы ў лічбавым фармаце, трэба мець адмысловы тэлевізар ці набыць спецыяльную прыстаўку.

Народная Воля http://www.nv-online.info 24 ВЕРАСНЯ 2013 г.

ЕЎРАСАЮЗ

Следам за Украінай

Малдова і Грузія могуць падпісаць пагадненне з ЕС у 2014 годзе

Пра гэта паведаміў еўракамісар па пытаннях пашырэння ЕС і палітыкі суседства Штэфан Фюле.

— Таццяна Сяргееўна, вы ж, канечне, не забылі той, паміж зімою і вясной, вечар у Малой зале Белдзяржфілармоніі, калі паэтычны тэатр Галіны Дзягілевай цудоўнай кампазіцыяй па творах Сяргея Іванавіча распачаў яго юбілейны год? І, мабыць, заўважылі, як і ўсе, у сцэнічнай інсталяцыі старадаўнюю, вытанчанай работы лямпу, якіх цяпер не бывае — хіба што ў антыкварных калекцыях. Яна гарэла і гарэла, прыцягваючы погляд, і ў арэоле яе святла мне мроіўся другі агеньчык — з далёкага 1936 года. Ён аддаляўся і знікаў у акне дома, з якога толькі што маладога паэта выхапілі нядобрыя рукі, кінулі ў чорны "варанок", павезлі аж на 20 (!) гадоў па ўсіх колах пекла і расстання з родным кутам. На стале пад лямпай застаўся недапісаны верш, а перад арыштантам паўставала глухой сцяной нешта незразумелае, бязлітаснае, пачварнае...

А вам, шаноўная Таццяна Сяргееўна, што высвеціла тая лямпа?

— Перш за ўсё — яе сцэнарную непрыдуманасць. Не ведаю ўжо, дзе гэта ўсюдыісная руплівіца беларускай нівы Галіна Дзягілева разам з калегамі па тэатры знайшла амаль такую ж, што нейкім чынам апынулася ў сялянскім жытле яшчэ да таго, як сям'я Грахоўскіх пасялілася тут. А лямпа на сцэне тэатра "Зніч" вярнула мяне на сто гадоў таму у старажытнае мястэчка Глуск, асвятліла дзяцінства і юнацтва бацькі, якія тут і прайшлі.

...Сям'ёй фактычна былі толькі Сяргей ды маці Ганна Парамонаўна. Бацька яму помніўся цьмяна: той то ваяваў на грамадзянскай, то шукаў заробак часцей па-за Глускам. Быў ён па натуры, праўду кажучы, вандроўнік-валацужнік. І можна зразумець, чаму амаль што другой сям'ёй для майго бацькі стаў дом Бобрыкаў, брата маці. Дзядзька — каваль, прыдумшчык розных гісторый, дасціпны апавядальнік. Трэба ж: меў сваіх чацвёра дзетак і яшчэ гадаваў пляменніка, якому было цікава і цёпла ў вялікай, добразычлівай сям'і сваякоў. Наогул мне здаецца, што талент бацькі — генетычна ад Бобрыкаў. Там усе дзеці былі здольныя да навукі, з творчай жылкай. Адтуль выйшлі знакамітыя ўрачы і паэт Янка Бобрык. Да яго цягнуўся і пляменнік.

Маці ж была малапісьменная, але мудрая, добрая і вельмі працавітая жанчына. Сын быў сэнсам жыцця: яму — уся любоў, увесь клопат. Святло мацярынскага сэрца было ярчэйшае за тысячы лямп. Боль ад яе заўчаснай страты працінаў душу бацькі праз усё жыццё. Цэлы вянок кранальных вершаў ён прысвяціў дарагой маці. А самы першы — "Мама" — стаў і самым знакамітым, любімым многімі, завучваўся і чытаўся на памяць. Класіка! І не мною ўпершыню сказана.

— Вядома, як любіў Сяргей Іванавіч свой Глуск, да канца дзён быў прывязаны да яго ўсімі ніцямі душы і сэрца. Не ў прыклад тым, хто, выйшаўшы з глыбінкі, сароміецца сваёй "правінцыйнасці". Паэт з любоўю і пяшчотай вымаўляў "мястэчка... мястэчка" і шмат пісаў пра яго і ў вершах, і ў аповесці.

— Глуск для яго — радзіма, мама, дом, Бобрыкі, сябры дзяцінства, прыгажосць наваколля і чалавечых стасункаў. Здаецца, што большасць яго лірычных вершаў прарасла з успамінаў пра глускую пару яго юначых гадоў. Так фарміраваўся характар і талент бацькі. Глускія ўспаміны — як мур, што трымаў яго ўсё жыццё.

— Колькі разоў чула ад самога Сяргея Іванавіча, як любілі і цанілі свайго земляка ў Глуску, як чакалі яго тут, з усёй цеплынёй і гасціннасцю сустракалі. Запрашалі на святы паэзіі ў школы і бібліятэкі, радавалі сваімі талентамі...

— І цяпер, дзякуй Богу, шануюць. Напярэдадні свята мы ўсёй сям'ёй — я з мужам Навумам, мой брат Аляксандр, унук Сяргея Іванавіча Андрэй — запрошаны ў Глуск на адкрыццё музейнай экспазіцыі ў гонар Сяргея Грахоўскага. А да яго 90-годдзя ў самым цэнтры Глуска быў усталяваны барэльеф паэта — на бульвары яго імя! Школа №1 атрымала імя свайго славутага земляка і колішняга яе вучня. А якое ж было зладжана незабыўнае, шматлюднае, сапраўды народнае свята яго паэзіі!

Не магу не сказаць пра цэлы "серыял" сістэматычных публікацый у раённай газеце, першы нумар якой, дарэчы, калісьці рабіў малады Сяргей Грахоўскі (здаецца, у 1931 годзе). Як шкада, што ўсяго некалькі месяцаў бацька не дажыў да гэтага свята, не пабачыў яго. Вось так бы і паўсюдна шанаваць сваіх паэтаў, як робіцца ў Глуску шырокай грамадскасцю і раённым кіраўніцтвам.

— Дазвольце, шаноўная Таццяна Сяргееўна, адзін успамін, які, напэўна, і ў вашай памяці не сцёрся. Запрасілі аднойчы Сяргея Іванавіча ў Дом дружбы сказаць сваё слова на вечарыне ў памяць і гонар ужо згаданага славутага яго сябра Забэйды-Суміцкага. Сяргей Іванавіч, зразумела, не мог адмовіць, але ў прызначаны дзень ледзь не да апошняй хвіліны не ведаў, ці здолее выбрацца з дому: такая навалілася нямогласць — хоць каравул крычы! І ўсё ж ён паспеў да пачатку, прыбыў у суправаджэнні вас і вашай мамы, яго жонкі Валянціны Міхайлаўны. Усе ўздыхнулі з палёгкай, і адразу ў люднай зале стала ціхаціха... Сяргей Іванавіч пачаў зусім нягучна, і слухачы лавілі кожнае яго слова — гэтак заварожваючы-цікава, як, дарэчы, і заўсёды, ён размаўляў з людзьмі, адкрываючы запаветныя куточкі свайго сэрца. І па меры таго, як разгортваў выступоўца сувой сваёй фенаменальнай памяці, голас яго дужэў, набываў заўсёдную напоўненасць сілай пачуццяў, звонкасць і палётнасць, і ён сам распраўляўся, скідваў год за годам са сваіх ужо немаладых плеч. Гэта быў цуд! Цуд улады над цяжарам перажатага, над самім сабой, над усемагутным часам.

— Нешта падобнае адчувала і я — таксама не раз! І кожны раз бачыла не тое што павагу і пачцівасць, а радаснае здзіўленне слухачоў і чытачоў самой асобай паэта. Сяргей Грахоўскі быў жывым увасабленнем бязмежных магчымасцяў чалавечага духу.

— Камусьці здавалася: абарваны на самым пачатку жыццёвы і творчы палёт скончыўся. Цэлых дваццаць (!) самых лепшых маладых гадоў вырваны, стаптаны так, каб ужо ніколі не мог падняцца. А ён падняўся, разгарнуўся, ды яшчэ як! Сярод выкашанага бязлітаснай, крывавай касой сталіншчыны багатага лугу беларускай літаратуры, які буяў рознымі кветкамі, шматколернасцю фарбаў і адценняў, цудам ацалелі толькі адзінкі. І цудам вярталіся да жыцця. Працавалі, збіралі добры плён — дзякуй ім і паклон за гэта! Але ў кагосьці сіл і часу ўжо не засталося, нехта і зусім сціх-змоўк, каб не трапіць зноў у нейкую пастку: часы быццам і змяніліся, але падобна, што толькі "быццам"...

Ваш бацька — не я адна так думаю — здолеў зрабіць, здавалася б, немагчымае. Пасля вяртання на волю яго паэтычны і пісьменніцкі дар, асвечаны душэўнай чысцінёй, дабрынёй і любоўю, непахіснасцю ў непрыманні зла, разгараўся ўсё ярчэй і ярчэй...

— І я не перастаю здзіўляцца і разгадваць: адкуль гэта ўсё? Хіба не таямніца? Між тым ніякага гучна абвешчанага крэда ў яго не было. Толькі — жаданне аддаваць усяго сябе людзям, абараняць іх сілаю Праўды. Адсюль і мужная гатоўнасць быць сведкам на Судзе гісторыі над тымі, хто столькі нязводных бед прынёс свайму ж народу і хто не заслугоўвае даравання. Так з'явілася на свет яго бяспрыкладная трылогія з дакументальна-аўтабіяграфічных аповесцяў ("Зона маўчання", "Такія сінія снягі" і "З воўчым білетам"), напісалася шмат моцных вершаў. Сапраўды гіганцкая праца зроблена больш як за 70 год нястомнага шчыравання ў літаратуры! Адна за другой з канца 1950-х выходзяць яго кнігі: паэзія, проза, публіцыстыка, мемуары, пераклады, творы для дзяцей, тэле- і радыёперадачы, сцэнарыі. Напэўна, не ўсё яшчэ ўспомніла. На вялікі жаль, наш былы акадэмічны Інстытут літаратуры амаль не займаўся яго творчасцю (за выключэннем хіба Лідзіі Сямёнаўны Савік). Пэўна, нечага ўсё баяцца. Так мне здаецца.

— І не толькі вам.

— Я нават не ўяўляю сабе, колькі ім напісана вершаў. Іх, вядома, трэба чытаць па многу разоў — толькі тады раскрываецца ўся іх глыбіня, філасофія, касмічны сэнс. Раптам у радках, якія ведаю даўно на памяць, спасцігаю новы сэнс, прыгажосць і вобразнасць, не спазнаныя раней. Ну, прыкладам, верш створаны раней, а дапрацаваны ў апошнія гады. "Сцюжа" называецца. На першы погляд — прыгожая зімовая замалёўка, ледзь не для чытання дзятвы. А заканчваецца гэта завірушная прыгажосць так:

Лепш рынуся ў шал крутаверці,
Нягодам пайду напралом,
Бо лепш незламаным памерці,
Чым жыць з перабітым крылом.

Вось вам і "дзіцячы вершык"! У вынашаных, народжаных у жыццёвых пакутах радках — глыбіня і сіла перакананага змагара духу.

...Не, лепш спынюся расказваць пра творчасць Сяргея Грахоўскага, інакш ніколі не скончу. Надта вялікая і хвалюючая тэма. Яго трэба ўдумліва чытаць. Выдавецтва "Звязда" падрыхтавала да выдання зборнік бацькавых твораў у серыі "Вядомы і невядомы". На мой погляд, кніжка будзе цікавай.

...А працаваў ён плённа аж да апошніх дзён жыцця, апошні цыкл вершаў надрукаваў за тры месяцы да смерці... Без яго падзвіжніцтва, без магутнай гулагаўскай трылогіі, публіцыстыкі, прысвечанай трагічнаму лёсу народа і многіх беларускіх творцаў, наша літаратура XX стагоддзя была б няпоўнай, як руская — без Салжаніцына...

— Мне нярэдка даводзілася бачыць Сяргея Іванавіча засяроджаным, заглыбленым у свае думкі, нават суровым. Маўклівым, з ценем на твары, хадзіў ён пад пошумам соснаў у Курапатах між пакутніцкіх крыжоў. І толькі потым, прысеўшы на лаву (тады яшчэ там былі лавачкі) ля Дарогі памяці, прамовіў ціха: "А тут жа, пад гэтымі крыжамі, толькі не ведаю, у якіх магілах, мае сябры маладосці. З некаторымі мы развіталіся ў турэмнай камеры..." Думаю, быў бы ўсцешаны, убачыўшы, што зараз на памятных крыжах з павязанымі вышытымі фартушкамі чырвоным на белым гараць іх імёны...

Такім жа сустрэла яго і ў дворыку вашага дома-"ветразя", калі ён дастаў маленькую, зямлістага колеру кніжачку-блакноцік, цудам захаваную ў схроне лагернай пары 1940-х гадоў. Дазволіў пагартаць унікальны рарытэт! А там — вершы, патрыятычныя вершы. І за іх, калі б толькі знайшлі, пагражала самая суровая кара.

— Бацька быў, безумоўна, розным у розныя моманты жыцця, шматгранным. А па натуры — найдабрэйшай душы чалавек, жыццялюбны, вясёлы. Прагны да яркіх уражанняў. Любіў музыку, тэатр, жывапіс (і сам маляваў пейзажы), вандраванні па свеце, асабліва па Беларусі, любаваўся прыродай, помнікамі архітэктуры. Не прапускаў, калі адпачываў у Юрмале, арганных канцэртаў у знакамітым рыжскім Домскім саборы, ды і ў нашай філармоніі ці оперы быў удзячным слухачом. А колькі чытаў і ведаў!

— Заўсёды разглядала бібліятэку ў ягоным рабочым кабінеце. На кніжных стэлажах на ўсіх сценах класіка, беларуская літаратура ці не з усімі даступнымі выданнямі, сучасныя творы. Дзесьці быў і куток з творамі гаспадара, але галоўнае — кнігі ягоных сяброў з дароўнымі надпісамі, шматлікія іх фатаграфіі. Сярод іх здымка самога Сяргея Іванавіча, калі спатрэбілася, я і не знайшла...

— Як ён умеў сябраваць, як даражыў сябрамі, можна расказваць і расказваць. Сябраваў з кампазітарамі, артыстамі, з рознымі людзьмі. Самымі блізкімі былі літаратары аднаго з ім лёсу, у іх была агульная тэма і агульны боль на ўсё жыццё. Яны разумелі адзін аднаго, як браты... Былі і новыя сябры — маладзейшыя, што прыйшлі ў літаратуру пасля вайны. Чыталі па тэлефоне адзін аднаму новыя творы, раіліся, абмяркоўвалі. Радаваліся ўдачам. Колькі цудоўных успамінаў напісаў бацька пра літаратараў свайго пакалення і тых, хто з маладзейшага выраю. Багацце для гісторыі нашай літаратуры! Для кожнага, каго цаніў, у яго знаходзіліся цёплыя словы захаплення, падтрымкі, мудрай тактоўнай заўвагі. Былі ў яго сябрах і фізікі, і лірыкі, і страту кожнага друга ён перажываў як страту роднага чалавека.

— А ў апошнія гады...

— У старасці бедаваў, што няма каму пазваніць, каму пачытаць новае, паспавядацца. Шчодра дарыў свае кніжкі чытачам, добрым знаёмым. У апошнія гады бедаваў пра далейшы лёс сваёй бібліятэкі — адзінае яго багацце. Вялізную яе частку падараваў Глускай бібліятэцы, частку перадаў у Дзяржаўны архіў-музей. А частку бібліятэкі мы, сямейнікі, падаравалі Універсітэту культуры і мастацтваў. Хай карыстаецца моладзь.

...Новыя вершы ён звычайна чытаў сям'і. Давяраў нашаму густу, прыслухоўваўся. І папраўляў. Былі вершы, у якія мы ўлюбляліся адразу і назаўсёды — як "Саксафаніст", "Мой лепшы твор"...

Для мяне бацька — гэта падарунак лёсу, за які я (і ўсе ў нашай сям'і) ніколі не здолеем расплаціцца. Яго літаратурная спадчына — наш галоўны скарб, які мы, веру, здолеем захаваць для нашчадкаў.

— Таццяна Сяргееўна, думаецца, у расповедзе пра вашага бацьку ну проста немагчыма не сказаць яшчэ пра аднаго галоўнага ў сям'і і неаддзельнага ад ягонага і вашага лёсу чалавека — пра вашу маці, жонку Сяргея Іванавіча Валянціну Міхайлаўну...

— Так, так! Яны — неадлучныя адно ад аднаго. Бацька прысвячаў ёй вершы ўсё жыццё, да апошніх дзён. Пранікнёныя, горкія і светлыя. А самы любімы ўсімі намі і мамаю — галоўны верш у нашай сям'і — "Я цябе прыгадаў..." (1956 г.).

— Раскажыце пра маці падрабязней...

— Была ў ёй нейкая недасяжнасць і непрадказальнасць, таямнічасць, як у зоркі. Што цікава надзвычай: яе знешні воблік зусім не супадаў з яе сутнасцю. Прыгажуня — маленькая, зграбная плацінавая бландзінка з шэрымі вачыма, гэткая андэрсанаўская русалачка. Побач з бацькам — высокім, дужым, спартыўным (ён да апошняга займаўся фізкультурай) — здавалася націнкай. А па сутнасці сваёй — надзіва моцны, валявы, мужны, бясстрашны, упарты чалавек з рашучым характарам. Гэты характар і ўратаваў нас усіх. Калісьці лепшая вучнёўка школы, выдатная студэнтка матфака, яна не паспела да вайны скончыць інстытут і вучылася ўжо ў Сібіры завочна... Жыла і працавала ў школе ў глухой вёсцы — без бібліятэкі, падручнікаў, кансультацый. Дзеля мужа і сваіх дзяцей яна магла звярнуць горы, адчыніць любыя дзверы. Для сябе ж ніколі і нічога не прасіла. Яе самаахвярнасць, нават у дробязях, у сям'і была часам аб'ектам любячых жартаў. Аднойчы на маскоўскім вакзале яна падаслала свой адзіны плашч мужчыну, які спаў на асфальце...

Зрэдку я бываю ў 50-й мінскай школе, дзе яна ў свой час выкладала матэматыку. Стаю ў фае другога паверха, і сэрца сціскаецца — здаецца, зараз пачую дробны стук яе абцасікаў, прамільгне яе зграбная постаць...

— Пра вашу маму жывуць легенды — непрыдуманыя легенды пра гераічную, без усялякіх агаворак і скідак, асобу. У "Такіх сініх снягах" Сяргей Іванавіч апісвае яе неардынарную па тых нечалавечых часах адысею. "Па дарозе" да яго ў сібірскую ссылку яна заехала са Слуцка ў Маскву і потым у Новасібірскі абкам КПСС (хоць ні яна, ні муж ніколі не былі ў кампартыі) і здабыла там — нечуваная рэч! — дазвол бацьку працаваць у школе. І паперынка, якую яна везла як найвялікшую каштоўнасць, усяліла надзею на нейкія перамены ўсёй тамтэйшай калоніі ссыльных.

— Бацька потым напіша: "Перад гэтай маленькай жанчынай мне хацелася стаць на калені..."

— Мне не забыцца, як за жалобным пахавальным сталом пасля праводзінаў Сяргея Іванавіча ў апошні шлях, сярод блізкіх сяброў зазвычай вельмі сціплая, негаваркая Валянціна Міхайлаўна стала распавядаць гісторыю, як дабіралася да яго, і мы пачулі яе з першых вуснаў. Пра гэтае доўгае блуканне па пакутах у кузавах грузавікоў, у абнімку з бочкамі бензіну ці газы і ўсялякага рыштунку. Яно нечакана скончылася сярод глухой бязлюднай тайгі: грузавік заграз, паламаўся, а наступны транспарт да запаветнага пункта — толькі заўтра. Наступала ноч. Ёй загадалі чакаць... Чакаць? Яна будзе чакаць? Валянціна рашуча выбралася з кузава і, нават не слухаючы пра папярэджанні (могуць сустрэцца лясныя драпежнікі), пакрочыла па невядомай раскіслай ад ліўняў дарозе ў цемру. Ішла ўсю ноч і не чула стомы, хоць залева не супынялася. А развіднела — глянуўшы на сваё аддзенне, жахнулася: усё змакрэлае да ніткі, у гразі, ігліцы... Хуткая сустрэча наперадзе звязала іх непарыўна.

— Высакародства, годнасць і сіла духу, светлы агеньчык, якім была мама, ды адданасць Беларусі ўзнялі бацьку над усімі трагедыямі жыцця і дапамаглі стаць чалавекам-стваральнікам.

— Нагадваюцца чамусьці прыгажэнныя залацістыя кветкі — рудбекіі, што аднойчы я везла Валянціне Міхайлаўне. У транспартнай цісканіне і духаце яны скукожыліся, абвялі, і мне было сорамна перад гаспадыняй: такая была сонечная краса, а цяпер — хіба што ў сметніцу... "Што вы, стойце, не выкідвайце! — адчайна ўзмалілася Валянціна Міхайлаўна. — Я іх ажыўлю, вось убачыце!"

Як яна чаравала над кветкамі — не ведаю і не бачыла. Толькі назаўтра, патэлефанаваўшы, пачула радасны галасок: "Не ўяўляеце, што за прыгажосць у вазе, якое сонца ў доме! Толькі адна кветачка звяла зусім".

Сонцам, што ажыўляла ўсё вакол, была сама Валянціна Міхайлаўна. Сама кволая апошнім часам (маладзейшая за мужа, перажыла яго ўсяго на 4 гады), паспявала падтрымаць, абагрэць, суцешыць. Не кажу ўжо пра яе сардэчную гасціннасць, непараўнальныя "фірменныя" піражкі, перад якімі — не ўстаяць!

— І я лічу: абое былі поплеч і ўпоравень.

— Згодна з вамі, дарагая Таццяна Сяргееўна. Дзякуй вялікі за дзейсную памяць, за гэту гутарку, тым болей што ведаю, колькі ў вас клопатаў-турбот перад урачыстымі сустрэчамі з прыхільнікамі творчасці Сяргея Грахоўскага ў Глуску і Навуковай бібліятэцы НАН Беларусі.

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.



Сяргей Іванавіч Грахоўскі з жонкай Валянцінай Міхайлаўнай.



Сустрэліся сябры-паэты: Генадзь Бураўкін, Язэп Семяжон, Расул Гамзатаў і Сяргей Грахоўскі *(1977 г.)*.

А цяпер — слова самому паэту.

Сяргей ГРАХОЎСКІ *Вершы розных гадоў*

***

Валянціне

Я цябе прыгадаў
Басаногаю, шустраю, тонкай,
Пад нагамі рассыпала
Раніца зерні расы,
І тады, у далёкія тыя часы,
Я цябе уяўляў
Залатою сасонкай,
І здавалася, будзеш такою заўжды —
Маладою, іскрыстаю, крышачку колкай.
Ды хіба ж загадаеш,
Каб вечна квітнелі сады
І ніколі на небе не гаслі вясёлкі?
Ды хіба ж загадаеш каму,
Каб гады
Над табою і мною улады не мелі,
Каб спынілася плынь веснавое вады,
Каб да старасці скроні у нас не сівелі?
Пасівелі, а сэрца не хоча старэць —
Мабыць, вызнана мала і зроблена мала.
Мы гарэлі ў агні, але нам не згарэць,
Навальніца прайшла, але нас не зламала.
Ты заўсёды была клапатліваю жонкай,
Ты суровай была міласэрнай сястрой.
Я цябе і цяпер уяўляю сасонкай,
Што яшчэ палымнее вячэрняй зарой.

1956

Сцюжа

Прадыхаю ў шыбіне вочка,
Зірну на блакітны мароз:
Трашчыць на вяроўцы сарочка,
Як ветразь завейных пагроз.
....

Ад сцюжы душа ледзянее,
Завея гудзе і гудзе...
За верай прыходзіць надзея,
Любоў да любові вядзе.

Ні сцюжа, ні горкая доля
Маю не астудзяць душу,
І ў дзікай стыхіі ніколі
Я літасці не папрашу,

Лепш рынуся ў шал крутаверці,
Нагодам пайду напралом,
Бо лепш незламаным памерці,
Чым жыць з перабітым крылом.

Душа

Мяне выхоўвалі,
Мяне захоўвалі,
Я то з'яўляўся,
То знікаў,
Мяне вадзілі
І ахоўвалі,
Хоць я нікуды
Не ўцякаў.

І пад замкамі,
І пад пломбамі,
Нібы каштоўнасць,
Берaглі
І неба клеткамі
І ромбамі
Разлінавалі,
Як маглі.

Мяне узважвалі і мералі,
Здымалі
Ў профіль і анфас,
Але ні разу
Не праверылі
Душы наяўнасць
І запас.

Шкада,
Што не здымаюць копію
З яе юрысты
І ўрачы,
І ні адна дактыласкопія
Не можа тут дапамагчы.

Мая душа
Супраціўлялася,
Бо верыла і тым жыла,
І не чарсцвела,
Не ламалася —
Была такою, як была.

Хоць дзіўна,
Ў чым яна трымалася,
А паспрабуй
Яе сагні!
Яна ж з маленства
Гартавалася
На чыстым,
Праведным агні.

1964

Дубовы ліст

Стаяць дубровы ў жнівеньскай красе,
Ляцяць у вырай жураўлі і гусі,
Дубовы ліст, у жылках і ў расе,
Мне нагадаў абрысы Беларусі.

Яго мая кранаецца рука,
А ён нібыта выкаваны з броні,
І жылка кожная дубовага лістка
Злілася з жылкамі маёй далоні.

1962

Мой лепшы твор

Дачцэ Тані

За Уралам, за белай тайгою
Кожнай шыбай, зашклёнай ільдом,
Пазірае ў завею з тугою
Мной калісьці пастаўлены дом.

Хтось рыпучыя топча мясціны,
Замятае на ганку сляды,
І нікому цясляр не прысніцца
У пару і пакут, і бяды.

Кожны вугал трашчыць на марозе,
Вецер свішча ў расколах тайгі.
Хто ж ступае па хісткай падлозе,
Я гадаю у вечар даўгі.

І прыпомню стажок за павеццю,
Завірухай замецены двор,
І шчаслівы, што некаму свеціць
Мой найлепшы завершаны твор.

29 студзеня 1997 г.

СВОИМИ ГЛАЗАМИ

Как я путешествовала по Италии



Когда мы с подружкой готовили "телегу зимой" — летнее путешествие, выбор не случайно пал на итальянский "сапог". Приобщиться к великой культуре "ничегонеделания" и древнейшей цивилизации — это и было нашей целью. Ниже — рассказ о том, как мы "обули сапог" на четыре ноги.

Милан: перейти Альпы

5120 метров над уровнем моря. Самолет проплывает над заснеженными Альпами — и вот мы уже рассекаем небо над Апеннинским полуостровом. Принято считать, что "шнуровать итальянский сапог" следует сверху, поэтому отправной точкой становится Милан.

Милан — финансовый центр Италии, поэтому банки здесь на каждом углу и "белые воротнички" — неотъемлемый атрибут города. Где бы ты ни находился, миланца узнаешь по обуви: итальянская элегантность — в крови.

Самый удобный способ передвижения здесь — велосипед или мотороллер. Небольшие и юркие, они стали излюбленным транспортом молодежи и офисных служащих. Особенно много их на улицах в часы пик.

Итальянцы пересаживаются на автомобили, когда метеослужба прогнозирует дождь. В солнечные же дни машины стоят в гаражах, а миланцы передвигаются на двухколесных аппаратах. В шлемах, конечно.

Выходим на станции метро Cairoli Castello и оказываемся у замка Сфорца — одной из самых больших цитаделей Европы. Великая резиденция миланских герцогов сегодня превратилась в бизнес-площадку для людей африканского происхождения. Сумки от Dolce&Gabbana и Prada китайского "розлива", широкополые шляпы, разноцветные "бесплатные" фенечки, 330 мл воды за евро в сорокаградусную жару. Словом, бизнес идет.

Замок удивительно похож на московский Кремль. Разгадка проста: миланские архитекторы за основу будущего "сердца Москвы" взяли облик крепости Сфорца.

Сегодня замок облюбовали коты: в заросших травой канавах, на мостах и под ними, во внутренних двориках и на изящных площадях обитают уставшие от туристов звери.

Из древней крепости можно увидеть невероятное — Триумфальную арку. Сколько раз себя ни ущипни, сооружение не исчезает, мы по-прежнему в Милане. Арка Мира — задумка Наполеона. Парадокс в том, что французский полководец задумал монумент в честь своего триумфа, однако открыли Арку Мира уже после падения его империи.

Мы останавливаемся у коренного миланца Алессио (*Алесь по-нашему.* — **Авт.**). Алессио выращивает на балконе базилик и орегано, вкусно готовит треску в томатном соусе, обожает комиксы и никогда не пользуется утюгом.

После знакомства отправляемся к другу Алессио, дабы познать, что такое день рождения по-итальянски. Место для праздника выбрали на свежем воздухе, в так называемом "амфитеатре" близ стадиона "Сан-Сиро". Миланцы заказывают пиццу, разливают вино, не говорят тосты, бурно жестикулируют, общаются и к одиннадцати часам вечера расходятся по домам. Узнав, что мы из Беларуси, гости соревнуются в знании нашего языка, но в итоге вспоминают лишь одно слово — "штопор".



Не секрет, что вкуснейший кофе варят именно в Италии, но не каждый знает, что капуччино служит "лакмусовой бумажкой" для определения иностранцев. Дело в том, что местные пьют этот напиток только утром. Заказал капуччино на обед или ужин — значит, иностранец. Начинать день с чашки горячего кофейного напитка — для нас уже ритуал.

Кстати, Милан — один из центров мировой моды, здесь располагаются бутики известнейших брендов: от LouisVuitton до Armani. В стеклянных витринах лежат клатчи (маленькие женские сумочки-конверты), стоимость которых вдвое превышает бюджет нашего недельного путешествия. Интересно, что магазины этого квартала, как правило, убыточны из-за высокой стоимости аренды. Но престиж дорогого стоит: в бутики попадают богатые иностранцы. Сами же итальянцы редко покупают здесь вещи.

Впрочем, в Милане материальное меркнет перед духовным. Успех измеряется не автомобилями, квартирами, дачами, а наличием годового абонемента в один из лучших оперных театров планеты — Ла-Скала.

Напротив Ла-Скала можно посидеть на лавочке под памятником Леонардо да Винчи, куда слетаются голуби и туристы. Все помнят его легендарную "Тайную вечерю", но не все знают, где она находится. Пьяцца Санта-Мария-делле-Грацие, 2 — вот точный адрес. Но, чтобы увидеть фреску, нужно забронировать себе билетик недели за две, а порой — и за два месяца.

В Италии нас поджидает много кулинарных чудес. Например, пастицерии. Заходи и выбирай: пицца или паста. Пастицерии разбросаны по всему городу, однако к выбору места нужно подходить с умом. Первое правило бывалого путешественника — забыть о кафе и ресторанах на туристических улочках. Второе правило — ходить туда, где едят местные.

Изучение национальной кухни начинается с ужина по-милански. Отыскав уютную тратторию на берегу реки Олона, мы заказываем древнейшее блюдо итальянской кухни, символ города — ризотто по-милански.

Вдруг итальянцы за соседним столиком берут сахарницу и... щедро посыпают ее содержимым пасту. Только спустя неделю мы узнаем, что это был не сахар, а тертый пармезан в специальной емкости — пармезаннице.

Мы угощаемся типично итальянской легкой закуской из помидоров, моцареллы, базилика и оливкового масла — капрезе. Пьем холодное домашнее красное вино, удивительно дешевое. Приносят заказ. На блюде — огромная порция ароматного горячего риса желтого цвета с шафраном, пармезаном и сливочным маслом. Кстати, в Северной Италии нет того самого культа оливкового масла, характерного для Тосканы и Южной Италии. Здесь все по-другому: северный регион славится сливочным маслом.



Хозяин траттории радушен и учтив: интересуется, откуда мы. Узнав, что из Беларуси, неуверенно кивает. Далее применяет итальянскую аксиому: футбол — лучшая география. Интересуется белорусскими футбольными командами, однако, увы, название БАТЭ ему ни о чем не говорит. Жаль...

Милан мы покидаем со старинного вокзала, и через пару минут скоростная электричка мчит нас к удивительным красотам...

Пескьера-дель-Гарда: dolce vita

Озеро Гарда — самое большое озеро в Италии. Оно входит в число красивейших озер мира. И не зря. Лазурная водичка окружена Альпами и лимонными рощами, снежные вершины пронзают облака насквозь — сердце замирает. Пейзаж, достойный собирать тысячи богатеньких австрийцев и немцев на побережье, буквально усыпанном крошечными курортными городками. Между тем береговая линия растянулась на десятки километров: озеро почти в шесть раз больше, например, Вилейского водохранилища.

Пескьера-дель-Гарда — типичный курортный городок на озере. Все здесь сделано с чувством, толком, расстановкой: украшенные акациями и азалиями мосты, фешенебельные виллы, ровными рядами припаркованные яхты, аллеи пиний, ресторанчики с открыточным видом у кромки воды. К слову, в одном из последних нам довелось попробовать на завтрак лимончелло — традиционный итальянский ликер из вымоченных в спирте лимонных корок.

На галечном пляже не ступить — европейские пенсионеры, многодетные и не очень семьи, молодожены в медовом месяце... Из развлечений здесь можно арендовать прогулочную яхту на час-другой за какие-нибудь 100 евро, порыбачить или бесплатно поплавать в озере с лебедями, ведь в Гарде вода пресная.

Словом, рай — не меньше. Но задерживаться в раю нельзя — спешим в Верону.

Верона: романтика Шекспира

Именно в Вероне нам впервые пришлось столкнуться с итальянской непунктуальностью, уже ставшей притчей во языцех. Расписание автобусов висит, словно декорация: можно прождать несколько часов и не всегда дождаться.

Наконец долгожданный автобус привозит нас на пьяцца Бра, и мы ахаем, взглянув на Арену ди Верона. Амфитеатр действительно заслуживает восхищенных вздохов. Веронской арене почти две тысячи лет, а она и по сей день собирает тысячи людей на представления. Гладиаторские бои и морские сражения — уже в прошлом. Сегодня Арена ди Верона — самый большой оперный театр под открытым небом. Здесь можно послушать "Аиду", сидя на каменных ступенях.

Славу столицы любви Вероне принес иностранец, никогда в ней не бывавший, — Уильям Шекспир. Миф пришелся по вкусу туристам, и весь мир съезжается сюда сфотографироваться на балконе Джульетты и прикоснуться к правой груди статуи, натертой до ослепительного блеска. Подняться на балкон — 8 евро, прикоснуться к груди — бесплатно.

Во дворике Джульетты все пространство занято туристами. Здесь оставляют любовные послания на стене, скрепляют любовь розовыми замочками и зачем-то приклеивают жвачки к стене. Выражаем сочувствие Джульетте и покидаем этот непростой дворик.

Верона — город розового мрамора. Здесь много солнца, руин и тесных улочек. Некоторые писатели сравнивали его с "цветущими персиковыми деревьями".

Двигаемся к Пьяцца дель Синьория на встречу с Данте. Веронская молодежь толпится под огромной статуей из каррарского мрамора: у памятника назначают любовные свидания, встречаются с друзьями и отыскиваются потерявшиеся туристы.

Затем нас встречает Марко — флегматичный веронец, который даст нам кров. Мы доверяемся местному жителю и следуем за ним в веронскую тратторию. Здесь я впервые знакомлюсь с настоящей итальянской пиццей, и с этого момента все предыдущие съеденные мной пиццы считаются недействительными. Правильная пицца выпекается в специальной дровяной печи. Настоящее искусство!



Темнеет. Приходит время познакомиться с итальянским стилем вождения. Сказать "страшно до смерти" — ничего не сказать. По серпантину на скорости 120 км/ч — этого словами не передать.

Самый красивый вид этого города открывается с холма Святого Петра. Не каждый турист доползет до середины холма, поэтому людей здесь немного. Особенно ночью. Мы, словно короли ночной Вероны, фиксируем панораму — финальный кадр, который дарит нам этот город...

Виолетта САВЧИЦ.
Фото автора.

(Продолжение следует.)

МАЗАІКА

Чым парадуюць "Зубры" балельшчыкаў у Мінску?

Пятае паражэнне запар пацярпела мінскае "Дынама" ў чэмпіянаце КХЛ. У мінулую нядзелю ў Яраслаўлі каманда Аляксандра Андрыеўскага прайграла "Лакаматыву" з лікам 1:4.

Пасля 8 матчаў "Дынама" з адной перамогай і 4 ачкамі займае 13-е месца ў сваёй канферэнцыі і 27-е — у агульнай табліцы.

Наступныя сем матчаў "Дынама" правядзе дома: 28 верасня — з "Аўтамабілістам", 30-га — з "Барысам", 2 кастрычніка — з "Югрой", 4-га — з "Авангардам", 9-га — з "Медзвяшчакам", 11-га — са "Спартаком", 13-га — з "Данбасам".

Можа, на "Мінск-Арэне" "Дынама" парадуе балельшчыкаў?

БАТЭ нарэшце выйшаў у лідары

У заключным матчы 24-га тура футбольнага чэмпіянату Беларусі 22 верасня мінскае "Дынама" выйграла ў Гродне ў "Нёмана" з лікам 1:0 і ўмацавала свае пазіцыі ў барацьбе з "Гомелем" за бронзавыя медалі.

Напярэдадні барысаўскі БАТЭ перамог салігорскі "Шахцёр" — 3:0, а "Тарпеда-БелАЗ" (Жодзіна) — "Гомель" — 2:1.

У другой шасцёрцы "Славія" (Мазыр) выйграла дома ў "Дняпра" (Магілёў) — 2:1, а "Белшына" (Бабруйск) — у "Мінска" — 3:1. У суботу "Нафтан" (Наваполацк) саступіў брэсцкаму "Дынама" — 1:3.

Становішча каманд:

першая шасцёрка: БАТЭ — 54 ачкі, "Шахцёр" — 52, "Дынама" (Мінск) — 40, "Гомель" — 34, "Тарпеда-БелАЗ" — 31, "Нёман" — 30;

другая шасцёрка: "Белшына" — 34, "Мінск" — 28, "Дынама" (Брэст) — 27, "Днепр" — 26, "Нафтан" — 21, "Славія" — 19.

Наступны тур пройдзе 28—29 верасня.

Не пашэнціла...

У стартавым матчы групавога раўнда Лігі чэмпіёнаў па гандболе сярод мужчын 21 верасня мінскае "Дынама" прайграла на выездзе французскаму "Пары Сен-Жэрмену" з лікам 30:34 (11:12).

Вынікі астатніх сустрэч першага тура ў групе С: "Тун" (Швейцарыя) — "Металург" (Македонія) — 22:23 (9:13), "Вардар" (Македонія) — "Барселона" (Іспанія) — 29:29 (15:19) (найлепшы бамбардзір у складзе гасцей — Сяргей Рутэнка, 8 мячоў).

Наступны матч "Дынама" правядзе 25 верасня на сваёй пляцоўцы супраць "Вардара".

Вучыце мову!

Пачаўся працэс моўнай падрыхтоўкі супрацоўнікаў мінскай міліцыі, якія будуць непасрэдна задзейнічаны ў ахове грамадскага парадку на чэмпіянаце свету па хакеі 2014 года.

Як паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама, у падраздзяленнях адабраны прыкладна 500 супрацоўнікаў, якія будуць ахоўваць грамадскі парадак на мерапрыемствах чэмпіянату свету па хакеі. Адным з крытэрыяў стала базавае веданне англійскай мовы.

З 12 верасня выбраныя супрацоўнікі пачалі тэсціраванне, пасля чаго будуць сфарміраваны вучэбныя групы. Плануецца, што ў групы будуць уваходзіць не больш за 15 чалавек. Навучанне будзе арганізавана па восем гадзін на тыдзень, паведамляе БелаПАН...

ШАШКІ


Міжнародныя гросмайстры

9 ліпеня мы інфармавалі, што ў першынстве Еўропы двойчы чэмпіён Беларусі Яўген Кандрачэнка з Гомеля заваяваў бронзавы медаль. Сёння прыемна дадаць: улічваючы вынікі чэмпіянату кантынента, ФМЖД прысвоіла яму ганаровае званне міжнароднага гросмайстра па шашках-64. Новыя эпізоды з партый, дасланыя ім у рэдакцыю, таксама сведчаць аб яго моцнай і якаснай гульні:

1 (бліцтурнір 2010 года). **Белыя** (Ю.Кірылаў, мгр): a1, a3, a5, b4, c1, e1, e3, f2, f4, g1 (10). **Чорныя** (Я.Кандрачэнка): b6, b8, c3, c5, c7, d6, d8, f6, h2, h6, h8 (11). Тут чорныя нечакана правялі камбінацыю. Больш карысна знайсці яе самім, не чакаючы нашых адказаў.

2. **Белыя** (Я.Кандрачэнка): a5, b2, c1, c3, d2, d4, e1, e3, f2, f4, g1 (11). **Чорныя** (М.Абацыеў): a3, a7, b6, c7, d6, d8, e7, g5, g7, h4, h6 (11). Чэмпіянат свету 2006 года па бліцу: 1. de5 ef6 2. cd4 dc5 3. bc3 cb4 4. ed6! 5. a:c7 6. c:c7x.

3. **Белыя** (А.Дашкоў, мгр): a1, b2, c1, c5, d2, d4, e1, f2, f4, g1, g3 (11). **Чорныя** (Я.Кандрачэнка): a5, a7, b8, c7, d8, e7, f6, f8, h4, h6, h8 (11). Бліц, 2009: 1. de3? fg5 2. cb6 a:c5 3. d:b6 ba7x.



Самае высокае спартыўнае званне атрымаў і мінчанін Васіль Грабенка — за поспехі ў міжнародных спаборніцвах па шашачнай кампазіцыі. З іх у 2-м першынстве свету па складанні эцюдаў-100 заняў 4-е прызавое месца ў агульным заліку. Пазнаёмцеся і з яго творчасцю:

4. **Белыя**: 7, дамкі 11, 48 (3). **Чорныя**: 18, 19, 20, 22, 28, 35, 38 (7). 5-е заліковае для кваліфікацыі месца ў катэгорыі B (71,5 ачка па змесце): 2 (19-23ABC), 17, 49 (33D) 34(28E) 1/7(39) 6(33) 32(24) 11(29F) 6(40G) 328, 35 (34H) 44x. A(32) 25 (40I) 35 (45) 37, 40, 46x. B(18-23) 15 (40) 47 (45) 31 (33J) 38 (50) 39/44x. C(20-24) 17, 49 (22) 32, 18 (23) 15/20 (40) 33, 50x. D(24) 42 (32K, 24) 20/15x. E(25) 48 (22LM) 38, 29/45x. F(30) 23 (40) 45 (38) 50 (42) 34, 47x. G(34) 23 (350NO) 238, 35 (39) 49x. H(33) 30 (38) 48x. I(37) 4(42) 15 (48P) 7/11 (26) 42, 7-34x. J(50) 45 (28-33) 29, 50x. Астатнія варыянты застаюцца за вамі.

5.**Белыя**: дамкі 19, 20, 26, 31 (4). **Чорныя**: 34, дамкі 17, 21 (3). 6-е заліковае месца ў катэгорыі C (58 ачкоў): 19-24 (40AB) 15 (40-44) 27, 50x. A(34-39) 15 (32CVp1) 12 (5D) 48 (44) 40, 10, 25, 39 (45) 50x. B(3) 40/45, 48 (14) 20, 404x. C(49) 12/3 (394) 21, 27, 50x. D(14) 35 (43) 21(48E) 154x. E(49) 18, 7, 154x. Vp1(44) 27, 50x.

Рашаем разам

"Адборачны да першынства свету" (С.Садоўскі—М.Кадзеснікаў): 1. cd6? hg3!! 2. f:d4 c:e1x. 2. d:h6 g:c3x.

"Заслугоўваюць увагі" (Ю.Голікаў): **№ 5** — 1. hg5 2. cd2 3. cb4 4. f:a5 fe3 5. gf2! 6. ad8 7. d:a5x.


Мікалай ГЛАДКІ.

ВАЖНО!

Как распознать инсульт?

Во время пикника молодая женщина споткнулась и упала. Выглядела она бледной, дрожала. Друзья предложили вызвать "скорую помощь", но Инга заверила всех, что все в порядке и что причина произошедшего всего лишь в новых туфлях.

Остаток дня Инга провела весело и непринужденно. Однако после пикника ее супруг огорошил знакомых новостью: его жену увезли в больницу. В 23.00 она скончалась. Оказалось, что на пикнике у нее случился инсульт — острое нарушение мозгового кровообращения.



Если бы друзья знали, как выглядят признаки инсульта, молодую женщину можно было спасти.

Инсульт — страшная болезнь, но это не значит, что она обязательно и немедленно приводит к смерти. Часто больному еще можно помочь, и чем скорее будет оказана помощь, тем больше шансов на жизнь и восстановление.

Нейрохирурги говорят: если они успевают к жертве инсульта в течение первых трех часов, то его последствия могут быть устранены. Главное — распознать и диагностировать инсульт и приступить к лечению в первые же часы, что, конечно, непросто.

Чтобы распознать инсульт, необходимо:

— попросить человека улыбнуться (в случае инсульта он не сможет этого сделать),

— попросить сказать простое предложение, например: "Сегодня хорошая погода" (если это вызовет сложности, немедленно обращайтесь за помощью),

— попросить поднять обе руки (при инсульте человек не сможет или только частично сможет поднять),

— попросить высунуть язык (если язык искривлен, повернут — это тоже признак инсульта).

Если проблемы возникнут даже с одним из этих заданий, нужно звонить в "скорую помощь" и описывать симптомы по телефону, чтобы врачи поторопились. И лучше не обращать внимания на заверения больного, что с ним все в порядке и это скоро пройдет: когда проблема станет очевидна ему самому — может быть уже поздно!

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл. (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

ISSN 2071-9647
9 772071 964000 13075

Падпісныя індэксы: 63222, 632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 23.09.2013 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 26550 экз. Заказ №3854.